Источник: "Рэспубліка" - 2014-07-01

# Па грыбы ды ў ягады

Ураджай грыбоў і ягад у гэтым годзе меншы, чым у мінулым. Таццяна Майсеева, навуковы супрацоўнік сектара харчовых і лекавых рэсурсаў лесу Інстытута лесу НАН, тлумачыць гэта спякотай, што стаяла ў канцы ліпеня — пачатку жніўня 2013-га і сёлетнімі замаразкамі. Затое паспелі ягады на сем—дзесяць дзён раней звычайнага. Чарніцы, для прыкладу, пачалі збіраць на Віцебшчыне прыблізна 25 чэрвеня, тады як звычайна яны толькі з'яўляюцца на поўдні.

Наперадзе — брусніцы. На Брэстчыне іх чакаюць прыблізна 8 жніўня, на Гомельшчыне — 11-га, апошнімі, 16 жніўня, ягады паспеюць на Віцебшчыне. Што датычыцца журавін, то брэстаўчане і гамяльчане змогуць нарыхтоўваць іх ужо з 20 жніўня, віцябчане — з 25-га.

Дарэчы, першыя лісічкі, белыя, падбярозавікі, маслякі, чырвонагаловікі ў гэтым годзе з'явіліся ў канцы мая, што таксама раней звычайнага.

**Кацярына ПАНЦЯЛЕЕВА**

Кацярына Панцялеева. Па грыбы ды ў ягады